**УДК 94(476) “9/13”**

# КНЯЖАЦКАЯ ЎЛАДА НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ IX – ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIII СТАГОДДЗЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ І РАСІЙСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

***Ю.М. КЕЖА***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Разгледжаны асноўныя працы беларускіх і расійскіх гісторыкаў XVIII – пачатку XXI стагоддзя, прысвечаныя даследаванню працэса станаўлення і развіцця дзяржаўнасці і княжацкай улады на беларускіх землях у кантэксце палітычнай гісторыі і дзяржаўнага ладу Старажытнай Русі IX – першай паловы XIII стагоддзя. Гісторыя станаўлення інстытутаў палітычнай улады – аб’ект шматгадовых, складаных дыскусій. У розныя перыяды існавання расійскай і беларускай гістарычнай навукі інстытут княжацкай улады разглядаўся пад рознымі пунктамі погляду ў залежнасці ад грамадскіх прыярытэтаў перыяду, у якім працавалі даследчыкі, яго сацыяльных, палітычных і эканмічных складнікаў.*

Праблема станаўлення і развіцця княжацкай улады на землях усходніх славян – адна з найбольш актуальных у айчыннай і замежнай гістарыяграфіі. Разгляд гэтага пытання ў працах гісторыкаў дазваляе сфармуляваць асноўныя палажэнні і характарыстыкі сацыяльна-палітычнага ладу на старажытнарускіх землях, прааналізаваць традыцыі вывучэння працэсаў зараджэння, станаўлення і эвалюцыі дзяржаўнай улады.

Пытанні эвалюцыі і палітычнай прыроды старажытнарускай дзяржаўнасці сыходзяць сваімі каранямі ў першыя летапісныя зводы, а першыя працы, прысвечаныя гэтаму пытанню, пачалі з’яўляцца ў XVIII стагоддзі. Расійская гістарыяграфія XVIII – першай паловы XIX стагоддзя па асноўным сваім змесце і прадмету даследавання з’яўлялася манархічнай. Пачатак рускай гісторыі быў звязаны з легендарным запрашэннем Рурыка з братамі, змешчаным у “Повести временных лет” пад 862 годам. Палітычная гісторыя гэтага часу разглядалася скрозь прызму дзейнасці князёў як асноўных носьбітаў дзяржаўнай улады. Згодна з асноўнымі гістарычнымі канцэпцыямі гэтага перыяду, у Старажытнай Русі існавала манархічнае, самадзяржаўнае праўленне. Выключэнне рабілася толькі для Ноўгарада. Гісторыя ўсходнеславянскіх зямель зводзілася да гісторыі развіцця манархіі: яе з’яўлення (са смерцю братоў Рурыка) і драблення (са смерцю Яраслава Мудрага, або Мсціслава Вялікага). Падобныя ўяўленні аб “кіеўскай манархіі” і “наўгародскай рэспубліцы” ў расійскай гістарыяграфіі існавалі да 40-х гадоў XIX стагоддзя.

Яскравым прадстаўніком манархічнага напрамку ў расійскай гістарычнай навуцы з’яўляўся **В.Н. Тацішчаў**. Яго праца ***“История Российская с самых древнейших времён”*** была апублікавана ў 1768 годзе. Асноўныя палажэнні гэтай працы зводзяцца да атаясамлення развіцця інстытута княжацкай улады ў Старажытнай Русі з развіццём манархіі. Кожную праяву вечавой актыўнасці гараджан Тацішчаў разглядаў або як агульнанародную раду князя, або як мяцеж. Адносна пытання спадчыннага княжацкага валодання В.Н. Тацішчаў лічыў, што дакладна ўсталяванага набыцця княжацкага пасада ў Старажытнай Русі не было. Спадчыннік вызначаўся рознымі спосабамі: па завяшчанні вялікага князя, па старэйшынству ў родзе, пры агульнанароднай падтрымцы, або набыццё пасада было звязана з “*коварством*” князёў [1, с. 53]. Развіццё вечавой актыўнасці В.Н. Тацішчаў звязваў з заняпадам вялікакняжацкай улады. Гісторык крытыкаваў дзяржаўны лад Ноўгарада, Пскова і Полацка, лічачы, што гэтыя гарады: “*учиня собственные демократические правительства, також власть великих князей уничтожили*” [1, с. 68].

Трэба адзначыць, што для даследавання гісторыі беларускіх зямель праца В.Н. Тацішчава каштоўная тым, што яна стала амаль адзіным паведамленнем, з якога можна даведацца аб змесце гістарычных крыніц, якія не захаваліся да нашага часу. У прыватнасці, шэраг гісторыкаў лічаць, што В.Н. Тацішчаў мог карыстацца згубленым Полацкім летапісам. Але, тым не меньш, да сведчанняў гэтага гісторыка трэба адносіцца насцярожана. Буйнай крыніцазнаўчай памылкай В.Н. Тацішчава было прызнанне Іаакімаўскага летапісу крыніцай, якае мае больш ранняе паходжанне ў параўнанні з “Повестью временных лет”. Але гэты летапіс быў складзены ў XVII стагоддзі і ўтрымлівае мноства легенд пра старажытную гісторыю славян і выдуманых князёў [2, с. 315].

Тацішчаў быў адным з першых гісторыкаў, які зрабіў спробу перыядызацыі гісторыі Полацкага княства. Гісторык вызначыў тры асноўныя перыяды: мясцовага княжэння; вечавы лад у Полацку; знаходжанне княства ў складзе Вялікага Княства Літоўскага. Апісваючы станаўленне мясцовых княжэнняў у землях усходніх славян, В.Н. Тацішчаў адносна Полацка паведамляе: “*Полоцкое, издревле относилось к Великой Руси, но Владимир I, отдав оное сыну Изяславу, отделил, и появилось первое местное княжение, от которого удельные были: Минское, Витебское, Двинское, в Кокенгаузе, Изяславльское и Дручевское*” [1, с. 105]. Такім чынам, В.Н. Тацішчаў вылучае мясцовае княжэнне ў Полацку з часоў Ізяслава Уладзіміравіча і далейшае яго развіццё як вечавую рэспубліку. Разглядаючы асвятленне гісторыі ўзаемаадносін паміж полацкімі і кіеўскімі князямі, В.Н. Тацішчаў апісваў іх як спрадвечную варожасць [1].

У параўнанні з В.Н. Тацішчавым, **М.М. Карамзін** у працы ***“История государства Российского”*** больш дэталёва паказывае развіццё грамадскага ладу, традыцыі і звычаі, складзеныя ў старажытнарускім грамадстве на аснове спадчыннага права. Паходжанне княжацкай улады на землях усходніх славян М.М. Карамзін выводзіць ад абмежаванай улады племяннога правадыра, які выконваў функцыю абароны ад знешняй небяспекі падчас войнаў. У мірны час кіраўніцтва было агульнанародным [3]. Далейшы генезіс княжацкай улады ў бок манархічнага кіравання М.М. Карамзін звязвае з прызваннем варага Рурыка ў 862 годзе. Але такія паняцці, як “монархия”, “единодержавие” і “единовластие”, у адпаведнасці з поглядамі таго часу не атаясамляваліся з самаўладдзем як абсалютнай уладай аднаго чалавека [4, с. 37]. Спасылаючыся на летапісныя звесткі, М.М. Карамзін вызначыў ролю княжацкай улады ў грамадстве і вылучыў асноўныя функцыі князёў. На думку гісторыка, старажытнарускія князі не толькі валодалі вярхоўнай і судовай уладай, але і выконвалі заканадаўчыя функцыі [3]. Аднак, здзяйсняючы галоўныя грамадскія функцыі ў дзяржаве, улада князя, па М.М. Карамзіну, была абмежавана агульнанародным сходам – вечам. Таксама князь меў раду са сваімі набліжанымі людзьмі – дружынай, якія складалі яго “*верховный Совет*” і з якімі ён “*делился властию*” [3, с. 47]. Як адзначае Е.Н. Дзярбін, М.М. Карамзін упершыню ў расійскай гістарыяграфіі “старался представить княжескую власть в домонгольской Руси во всем многообразии составляющих ее проблем” [4, с. 38]. Аднак трэба мець на ўвазе, што яго погляды ў цэлым не выходзяць за межы манархічнага накірунку ў гістарыяграфіі, закладзеныя В.Н. Тацішчавым і гісторыкамі-асветнікамі XVIII стагоддзя.

Разглядаючы гісторыю заходніх зямель Русі, М.М. Карамзін лічыў, што полацкі князь Усяслаў Брачыславіч, маючы прэтэнзіі на кіеўскае княжэнне, пападае ў арбіту палітычнай барацьбы паміж дзецьмі Яраслава Уладзіміравіча. Сцвярджэнне гісторыка, што Усяслаў з’яўляўся законным спадкаемцам вялікакняжацкага стала, дастаткова не абгрунтавана і выклікае супярэчнасці.

Палітычная гісторыя беларускіх зямель у працах расійскіх даследчыкаў XVIII – першай паловы XIX стагоддзя разглядалася даволі фрагментарна і была перш за ўсё звязана з дзейнасцю кіеўскіх князёў. Полацкаму, Тураўскаму, Смаленскаму княствам адводзілася роля перыферыйных зямель у дзяржаве пад назвай – Кіеўская Русь. У гэтай сувязі ў дарэвалюцыйныя часы гістарычнае развіццё заходніх зямель Русі не было самастойным прадметам даследавання. Са з’яўленнем у гістарычных даследаваннях сацыялагічных схем, удасканаленнем метадыкі навуковых пошукаў, пашырэннем аб’екта даследавання гісторыкі пачынаюць глядзець на развіццё дзяржаўных інстытутаў і палітычнай сістэмы як на вынік працяглага і складанага працэсу.

Кніга маскоўскага гістрыка **І.Д. Бяляева** ***“Рассказы из русской истории. История Полотска или Северо-Западной Руси от древнейших времён до Люблинской унии”*** была асобна прысвечана гісторыі Полацкай зямлі [5]. У гэтай працы аўтар наіўна лічыў Полацк прыгарадам Ноўгарада, поўнасцю залежным ад яго. Залежнасць Полацка ад Ноўгарада вызначалася, з пункту гледжання гісторыка, аднолькавым грамадскім ладам абодвух гарадоў: “*и полочане, как истые новгородцы, только по-новгородски и могли жить*” [5, с. 135]. Аўтар вылучае Полацкую зямлю сярод іншых зямель Заходняй Русі і адзначае больш высокае грамадскае развіццё полацкіх крывічоў у параўнанні з дрыгавічамі і літоўскімі плямёнамі. Гісторык адзначае залежнасць дрыгавічоў і літоўскіх плямён ад Полацка ў старажытнарускі перыяд [5]. Згодна з агульным дзяржаўным ладам Полацка і Ноугарада, І.Д. Бяляеў вылучае адзіны для абодвух гарадоў падзел грамадства на баяр, купцоў і “*чёрных людей*” [5, с. 138]. Княжацкая ўлада ў Полацкім княстве з часоў прызвання Рурыка была залежна ад Ноўгарада, і князі полацкія былі прадстаўнікамі наўгародскага князя. У Полацку, паводле І.Д. Бяляева, згодна з падабенствам палітычных інстытутаў, княжацкая ўлада была залежная ад веча.

Гістарычная канцэпцыя палітычнага развіцця старажытнарускіх зямель, паводле І.Д. Бяляева, звязана са значнай абмежаванасцю княжацкай улады народным сходам да прызвання варагаў. Пасля запрашэння Рурыка адбываецца ўзмацненне ўлады князя праз дзейнасць яго дружыны, якая засяродзіла ў сваіх руках функцыі суда і кіравання. Узмацненню ўлады князя і дружыны спрыяла незалежнасць іх ад зямлі [6]. Другім важным фактарам узмацнення княжацкай улады было прыняцце хрысціянства. Згодна з І.Д. Бяляевым, духавенства з’ўлялася праваднікам уяўленняў аб святасці княжацкай улады і паходжанні яе ад Бога. Заняпад княжацкай улады гісторык звязваў з разрастаннем дынастыі Рурыкавічаў і неўпарадкаванасцю міжкняжацкіх адносін [6]. Такім чынам, І.Д. Бяляеў вызначае грамадска-палітычны лад Старажытнай Русі як земшчыну з абшчынным ладам, вечавым кіраўніцтвам і выбарнымі інстытутамі палітычнай улады.

У другой палове XIX стагоддзя склалася дзяржаўная школа, у вытокаў якой стаяў **С.М. Салаўёў.** У працы ***“Об истории древней России”*** гісторык падрабязна распрацаваў схему працяглага працэсу станаўлення дзяржаўнага ладу праз развіццё радавых і сямейных адносін. Для С.М. Салаўёва радавы быт – аснова гарамадсіх адносін у старажытнасці. Галоўны кіраўнік рода павінен падтрымліваць унутраную нерухомасць і ўпарадкаванасць радавой арганізацыі. “*Власть, сила старшего в роду основывалась на согласии младших*”, – адзначае С.М. Салаўёў [7, с. 68]. У асобных выпадках, калі малодшыя браты не пагаджаліся са старэйшымі, узнікалі міжусобныя канфлікты. У выніку для ўсталявання грамадскага міру ра-

давыя старэйшыны павінны былі знайсці новую сілу, “*посредника в спорах беспристрастного*” [7, с. 71]. Такім прадстаўніком на ўладу, на думку гісторыка, мог быць толькі князь з чужога роду.

Але пасля запрашэння варагаў сутнасць і характар княжацкай улады не змянілася. Па-ранейшаму ў асноўныя абавязкі князя ўваходзіў збор апалчэння, князь займаецца судовай справай, зборам даніны і дыпламатычнымі стасункамі, заключае дамовы. Па меркаванні гісторыка, усталяванню княжацкай улады як сацыяльна-палітычнага інстытута спрыяла станаўленне дружыннай арганізацыі. Галоўным фактарам тут выступае тое, што дружыннікі прыўносілі ў грамадскае асяроддзе новы саслоўны пачатак, у супрацьвагу ранейшаму радавому. Аднак у параўнанні з дружыннай арганізацыяй Заходняй Еўропы на ўсходнеславянскіх землях дружыннікі былі ў большай ступені залежныя ад князя, таму што яны не валодалі зямлёй і іх матэрыяльнае становішча суцэльна залежыла ад яго. Адпаведна свайму статусу ў дружыне старэйшыя мужы (баяры) мелі пэўны ўплыў на князя, былі яго дарадцамі. Акрамя дружыны, пасля прыняцця хрысціянства ўплыў на грамадскае развіццё пачало аказваць духавенства.

З развіццём грамадства слабее радавы лад. У выніку ён захоўваецца толькі ў міжкняжацкіх адносінах. Гісторык выводзіў значэнне радавых стасункаў у Старажытнай Русі на аснове прынцыпу прыналежнасці ўлады ўсяму роду Рурыкавічаў [7]. Гісторык лічыў, што ў параўнанні з Заходняй Еўропай, дзе на працягу X – XIII стагоддзяў бурна развіваліся феадальныя адносіны, у Старажытнай Русі ўсе правы і абавязкі паміж князямі былі абумоўлены радавымі адносінамі. Пачатак змен у міжкняжацкіх адносінах С.М. Салаўёў звязваў з дзейнасцю Андрэя Багалюбскага. Менавіта гэты князь перанёс палітычны цэнтр усходнеславянскіх зямель з Кіева ў Паўночна-Усходнюю Русь, дзе пачалося развіццё адзінаўладдзя і дзяржаўны пачатак канчаткова перамог радавы.

Займаючыся разглядам гісторыі беларускіх зямель IX – XIII стагоддзяў, адасобленасць Полацка ад Кіева С.М. Салаўёў разглядаў як вынік асобнага становішча Ізяславічаў у родзе Рурыкавічаў. У сувязі са смерцю старэйшага сына Уладзіміра Святаславіча, Ізяслава, яшчэ пры жыцці бацькі (1001), яго нашчадкі выключаліся з прэтэндэнтаў на кіеўскі пасад. “Ізгойствам” Ізяславічаў С.М. Салаўёў тлумачыць непрымірымую варожасць полацкіх князёў да нашчадкаў Яраслава Уладзіміравіча [7]. Такім чынам, С.М. Салаўёў – адзін з першых гісторыкаў, хто разглядаў адасобленае становішча полацкіх князёў як вынік выдалення іх ад удзелу ў агульным радавым валоданні Руссю.

Канцэпцыя развіцця княжацкай улады на Русі ў адпаведнасці з тэорыяй барацьбы родавых і дзяржаўных адносін, распрацаваная С.М. Салаўёвым, аказала вялікі ўплыў на ўсю наступную айчынную гістарыяграфію, стаўшы зыходнай кропкай для яе дзяржаўна-юрыдычнага напрамку [4]. Аднак адным з істотных недахопаў канцэпцыі гісторыка з’яўляецца немагчымасць выйсці за межы манархічнай тэорыі ў даследаванні развіцця дзяржаўнай улады на старажытнарускіх землях.

У другой палове XIX стагоддзя асноўным апанентам С.М. Салаўёва выступаў **В.І. Сергеевіч**. З’яўляючыся прадстаўніком Санкт-Пецярбургскай юрыдычнай школы, В.І. Сергеевіч асноўную ўвагу надаваў даследаванню сацыяльна-палітычнай гісторыі Старажытнай Русі. Першая вялікая праца даследчыка ***“Вече и князь”*** стала адным з найбуйнейшых дасягненняў у расійскай гістарыяграфіі.

Асноўныя вытокі яго даследаванняў зводзяцца да “*договорной теории*” палітычнага ладу на землях Старажытнай Русі. Згодна з гэтай тэорыяй, на ўсёй прасторы старажытнарускіх зямель у часы князёў Рурыкавічаў і да татара-мангольскага нашэсця існаваў адзіны палітычны лад, які заключаўся ў функцыянаванні народных сходаў – веча [8]. На думку даследчыка, характар веча праяўляўся ў слабасці княжацкай улады і ўсемагутнасці асабістай свабоды [8]. Нягледзячы на зменлівасць вечавых сходаў, яны, як лічыў В.І. Сергеевіч, адыгрывалі галоўную ролю ў палітычным жыцці. Кампетэнцыя і функцыі веча былі амаль неабмежаваныя. У параўнанні з вечам, князь – стабільны інстытут палітычнай улады, але ён яшчэ не мае досыць развітых рычагоў кіравання. У яго няма стабільнага апарату кіравання. Тыя людзі, якія выконваюць яго распараджэнні, нават не звязаныя з ім пазямельнай сувяззю, якая надае трываласць феадальным адносінам [9]. У гэтай сувязі ўзаемаадносіны паміж вечам (якое, паводле В.І. Сергеевіча, з’яўлялася народным органам кіравання) і князем будаваліся па прынцыпу дамовы – “ряда”. Як адзначае даследчык, заключэнне “ряда” з князем з’яўлялася абавязковай умовай любога княжэння [8].

У міжкняжацкіх адносінах князі таксама кіраваліся дамовамі. Сродкамі для заключэння міжкняжацкіх дамоў з’яўляліся княжацкія з’езды, але яны не мелі абавязковага характару. Калі паміж князямі не было згоды, яны знаходзіліся ў стане варожасці ці вайны. Але гэта не датычылася адносін паміж князямі-сынамі і князем-бацькам, якія вызначаліся сямейным правам. З’яўляючыся асноўным апанентам С.М. Салаўёва, В.І. Сергеевіч не падзяляў яго думку аб тым, што старажытнарускія воласці з’яўляліся агульным спадчынным валоданнем Рурыкавічаў. Згодна з высновамі В.І. Сергеевіча, княжэнні не даставаліся ў спадчыну князям, а здабываліся імі [9].

Такім чынам, у аснове грамадска-палітычнай сістэмы старажытнарускіх зямель В.І. Сергеевіч бачыў дамоўныя адносіны. Пры аднабаковым юрыдычным разглядзе сацыяльна-палітычных інстытутаў Старажытнай Русі, без уліку ўсіх з’яў грамадскага жыцця, яго метады і атрыманыя вынікі аказалі вялікі

уплыў на далейшае развіццё даследаванняў палітычных інстытутаў усходнеславянскіх зямель, у прыватнасці на яе дзяржаўна-юрыдычны накірунак.

У канцы XIX стагоддзя з'явіліся першыя абагульняючыя працы аб старажытнарускіх княствах на тэрыторыі Беларусі. Гісторыкі **М.В. Доўнар-Запольскі** і **У.Е. Данілевіч** з'яўляліся выхаванцамі навуковай школы кіеўскага прафесара У.Б. Антановіча. Іх працы аказалі значны ўплыў на фарміраванне нацыянальнай накіраванасці ў даследаваннях палітычнай гісторыі беларускіх зямель.

У канцы XIX стагоддзя грунтоўную працу, прысвечаную гісторыі княстваў Полацкага і Тураўскага, напісаў М.В. Доўнар-Запольскі. У працы ***"Очерк истории Кривической и Дреговической земель до конца XII столетия"*** аўтар звярнуў увагу, што згодна з паведамленнем летапісаў існавалі племянныя княжэнні ў крывічоў і дрыгавічоў. Княжацкая ўлада ў гэтых плямёнах выйшла з абшчыны. На думку даследчыка, пасада князя як вярхоўнага прадстаўніка абшчыны была выбарнай і абмежаванай племянным вечам [10]. Развіваючы тэму вечавых сходаў, М.В. Доўнар-Запольскі сцвярджае, што асаблівую моц веча атрымала ў Полацкай зямлі. Ён адзначае, што рэзідэнцыя полацкага князя XII стагоддзя знаходзілася па-за горадам, у Бельчыцах, дзе побач з князем знаходзілася яго дружына [10]. Пры падабенстве дзяржаўнага ладу Ноўгарада і Полацка, гісторык адзначае, што наўгародскія князі ў параўнанні з полацкімі знаходзіліся ў лепшым становішчы. Наўгародскія князі паходзілі з роду Яраславічаў і пасля выгнання маглі знайсці сабе прытулак у іншым княстве. Полацкія князі, як паведамляе М.В. Доўнар-Запольскі, "*были совершенно отделены от остальной Руси, защиты искать было не у кого, уделов тоже; если они теряли стол в Полоцкой области, то должны были скитаться без княжения в чужих землях*" [10, с. 67 – 68].

Доўнар-Запольскі адмаўляе варажскае паходжанне Рагвалода, выдвігаючы гіпотэзу, што гэты князь быў нашчадкам мясцовых князёў. Таксама ён адмаўляе скандынаўскае паходжанне летапіснага князя Тура, лічачы паведамленне аб ім народным паданнем [10].

Даследчык адзначыў, што князь Святаполк Яраполкавіч, які пэўны час княжыў у Тураве, набіраў апалчэнне ў гэтым княстве і карыстаўся падтрымкай мясцовага насельніцтва [10]. Гісторык звяртае ўвагу на перыяд княжэння Усяслава Брачыславіча. На яго думку, Полацкае княства часоў Усяслава дасягнула піка сваёй магутнасці. Гэтаму спрыяла, на думку аўтара, знаходжанне ўлады ў руках аднаго князя [10].

Доўнар-Запольскі вызначыў асноўныя фактары, якія спрыялі драбленню зямель на асобныя ўдзелы, адзначаючы, што для разгляду ўдзельна-вечавога перыяду недастаткова вызначаць толькі адну прычыну, як гэта рабілі гісторыкі да яго [10]. Згодна з высновамі навукоўца, з другой паловы XII стагоддзя княжацкая ўлада ў землях становіцца вотчынай асобных княжацкіх ліній.

У пачатку XX стагоддзя М.В. Доўнарам-Запольскім была напісана асобная работа, прысвечаная арганізацыі ўлады на землях Старажытнай Русі, у тым ліку і беларускіх – ***"Политический строй Древней Руси. Вече и князь"***. У пачатку разгляду асобнай главы, прысвечанай княжацкай уладзе, Доўнар-Запольскі мае рацыю, калі адзначае, што "*к строю древних государств нельзя прилагать той мерки, которою мы определяем государственное устройство нынешнего времени*" [11, с. 33]. Такім чынам, гісторык не разглядае палітычныя інстытуты IX – XIII стагоддзяў скрозь прызму палітычных рэалій пачатку XX стагоддзя, як гэта часта рабілася да яго.

У працы гісторык падрабязна вызначыў і ахарактарызаваў асабістыя якасці, якімі павінен валодаць князь, каб знайсці падтрымку ў грамадстве. Да галоўных функцый князя даследчык адносіць судзебную дзейнасць і падтрыманне ўнутранага спакою ў дзяржаве. У кампетэнцыю князя ўваходзіла дзейнасць па заключэнню дамоў і саюзаў з іншымі князямі. Князь мог аб'яўляць вайну ці заключаць мір. Асаблівую ролю адыгрывае князь у справе абароны ад знешняй агрэсіі. На думку даследчыка, без князя нельга было весці ваенную справу, бо пры адсутнасці князя на полі бою яго войска было асуджана на паразу [11].

Адзаначаючы, што ўжо на першапачатковым этапе існавання старажытнарускай дзяржавы ўлада князя была значна абмежаванай, гісторык лічыў, што канчатковае аслабленне княжацкай улады звязана з дзейнасцю веча, якое набірае моц з сярэдзіны XII стагоддзя. Тым не меньш М.В. Доўнар-Запольскі адзначыў неаднароднасць вечавой актыўнасці на старажытнарускіх землях. У Паўночна-Усходняй Русі княжацкая ўлада была моцнай і амаль неабмежаванай. У сваю чаргу, перавага веча над князем у палітычным жыцці знайшла сваё адлюстравенне ў Полацкай і асабліва Наўгародскай землях. "*В конце древнерусского периода выработалось несколько типов княжеской власти, разница между которыми заключалась в степени силы веча и отдельных элементов общества, из которых оно состояло*" [11, с. 42].

Разглядаючы дзейнасць княжацкага савета, М.В. Доўнар-Запольскі адзначае, што на першапачатковым этапе развіцця дзяржаўнасці на землях усходніх славян княжацкімі дарадцамі былі прадстаўнікі яго старэйшай дружыны. Даследчык параўноўваў іх з major domus франкскага двара [11, с. 46]. На яго думку, з часоў Уладзіміра Святаславіча адбываецца пашырэнне кола княжацкіх дарадцаў. Таксама ў працы падрабязна разгледжана дзейнасць княжацкай адміністрацыі, яе асноўныя функцыі і абавязкі [11].

Гісторык У.Е. Данілевіч у сваей працы ***"Очерк истории Полоцкой земли до конца XIV столетия"*** у адрозненне ад расійскіх навукоўцаў па-іншаму ставіцца да асобы Усяслава Брачыславіча: "*В его* (Усяслава – *Ю. К.*) *время слава и могущество Полоцкой земли достигли высших пределов своего раз-*

*вития*” [12, с. 70]. Асобную ўвагу Данілевіч надае перыяду, які наступае пасля смерці Усяслава (пасля 1001 г.), і характарызуе гэты перыяд як удзельна-вечавы [12]. Як пазначае гісторык, “*При Всеславе и его предшественниках Полоцкая земля была соединена в одних руках, разделения на уделы еще не существовало, а потому многия явления удельно-вечеваго периода, которыя уже давали себя чувствовать в других русских землях, были еще неизвестны Полоцкой земле*” [12, с. 72]. Такім чынам, згодна з аўтарам, палітычная раздробленасць, якая пачалася на землях паўднёвай Русі фактычна пасля смерці Яраслава Уладзіміравіча (1054), на землях Полацкага княства пачалася на паўстагоддзе пазней. Данілевіч адзначыў асобную спецыфіку вывучэння гісторыі сярэдневяковай Полаччыны – ізаляванае палажэнне Полацкага княства абумовіла пэўныя адносіны да яго з боку летапісцаў: “*они* (летапісы – *Ю. К.*) *сообщают еще редкие сведения о Полоцкой земле до конца XII столетия, но затем она почти совершенно исчезает со страниц русских летописей, и только около половины XIV в. начинают появляться в летописях кое-какие известия о ней...*” [12, с. 13]. У даследаванні У.Е. Данілевіча прадстаўлена падрабязная рэканструкцыя палітычнай гісторыі рэгіёна, асобная ўвага нададзена полацка-літоўскім адносінам.

Грунтоўную працу ***“История Смоленской земли до начала XV столетия***”, якая ахоплівала і сучасную Усходнюю Беларусь, выдаў **П.В. Галубоўскі**. Даследуючы грамадскі лад Смаленскай зямлі, вучоны адзначае, што арганізацыя ўлады гэтага княства выцякала з абшчыннага пачатку, якое “*было у смоленских Кривичей господствующим*” [13, с. 212]. Таксама, разглядаючы ўзаемаадносіны паміж князем і вечам, гісторык лічыць, што імкненне народнага схода захаваць за сабой права вярхоўнага суда з’яўлялася адной з галоўных прычын барацьбы паміж гэтымі палітычнымі інстытутамі. Асобныя абшчыны Смаленскай зямлі захавалі за сабой права суда над сваімі членамі нават пасля фарміравання княжацкай улады. Для ажыццяўлення суда абшчыне было неабходна заплаціць князю гадавую віру [13].

Аналізуючы заканадаўчую дзейнасць органаў улады, П.В. Галубоўскі адзначае, што “*с незапамятных времён, как только запомнит история, кривицкое вече является главным хозяином во внутренних делах*” [13, с. 213]. Веча, якое з’яўлялася органам вярхоўнага кіраўніцтва ў княстве, захоўвала за сабой права ў выбары князя і пазбаўлення яго пасады. Без веча немагчыма ўстанаўленне даніны, дараванне зямлі або надзяленне асобнымі прывілеямі.

Барацьба паміж князем і вечам, адзначае П.В. Галубоўскі, праходзіць праз усю гісторыю Смаленска. Асабліва вострая барацьба прыпадае на перыяд княжэння Рамана і Давыда Расціславічаў. Раман Расціславіч яшчэ імкнуўся падтрымліваць добрыя адносіны з вечам, як гэта рабіў яго бацька Расціслаў Мсціславіч, які, па словах гісторыка, “*умел соблюдать права веча, что видно из уставной грамоты 1151 года*” [13, с. 219]. Але пры Давыдзе справы пагоршыліся. Неразуменне паміж князем і вечам прыводзіла да ўзброеных сутычак.

На думку Галубоўскага, князь з’яўляецца прадстаўніком усёй зямлі. Даследчык вылучае яго асноўныя функцыі: дыпламатычную (заключэнне дагавораў, прыняцце паслоў), судовую і вайсковую, дзе князь з’яўляецца кіраўніком народнага апалчэння. Але гісторык робіць заўвагу, што апалчэнне не заўсёды ўдзельнічае ў ваенных мерапрыемствах князя [13]. Ваенныя мерапрыемствы смаленскіх князёў, якія былі выкліканы не інтарэсамі ўсёй зямлі, а асабістымі мэтамі, ажыццяўляліся толькі з дапамогай княжацкай дружыны, без падтрымкі народнага апалчэння. Даследчык вызначыў асноўныя даходы, якія атрымліваў князь за выкананне судовай справы, за атрыманне гандлёвых падаткаў, збор даніны з гарадоў [13].

Вялікі ўклад у даследаванне палітычнай структуры дамангольскай Русі ўнёс **А.Е. Праснякоў**. Яго погляды на станаўленне і характар княжацкай улады на землях Старажытнай Русі знайшлі сваё адлюстраванне ў магістарскай дысертацыі ***“Княжое право в Древней Руси”*** і працы ***“Лекции по русской истории”*** [14; 15]. Згодна з погладамі А.Е. Праснякова, князі на Русі не знайшлі гатовага ўкладу гарадавых абласцей і народнага войска, але сам гэты лад склаўся дзякуючы арганізаваным намаганням князёў і іх дружын [14]. У сваёй дысертацыі вучоны распрацаваў тэорыю “*княжого права*”, згодна з якой адным з найважнейшых напрамкаў дзейнасці князёў было стварэнне побач са звычайна-прававымі саюзамі членаў племені адмысловага саюза княжай абароны, ў які ўваходзілі княжацкія дружыннікі і насельніцтва княжацкіх вёсак. Гісторык лічыў, што княжацкая абарона была агульнагістарычнай з’явай ва ўсіх еўрапейскіх народаў [14].

У сваіх даследаваннях А.Е. Праснякоў не пагаджаецца з С.М. Салаўёвым і В.І. Сергеевічам у пытаннях княжацкага ўладання. Вучоны лічыў, што Рурыкавічы ажыццяўлялі ўладу згодна з прынцыпам вялікай непадзельнай сям’і. Права на княжэнне ў кожнай воласці набывалася спадчынным валоданнем воласці па бацьку, згодна з сямейным правам. Такім чынам, раздрабленне Кіеўскай дзяржавы вучоны звязваў з сямейна-бацькоўскім правам, якое прадугледжвала падзел бацькоўскай маёмасці паміж сынамі [14]. Гісторык не разглядае княжацкую ўладу ў Старажытнай Русі як уладу аднаго князя або як калектыўную ўладу некалькіх князёў. Вучоны лічыў, што князь падзяляў вярхоўную ўладу разам з вечавой абшчынай. Князь заключаў дагавор з народным сходам, які быў замацаваны ўзаемным крыжацалаваннем. Такім чынам, на думку даследчыка, народ у асобе веча з’яўляўся галоўнай падтрымкай

князя. Асноўныя функцыі князя, якія ён павінен выконваць перад народным сходам, – знешняя абарона і падтрыманне ўнутранай бяспекі [14].

Даследаванні А.Е. Праснякова былі прадуктыўнымі для свайго часу, але з прычыны спецыфічнага развіцця расійскай гістарычнай навукі пасля 1917 года яны не значна паўплывалі на далейшыя пакаленні даследчыкаў [16, с. 11]. Ужо ў “Лекциях по русской истории”, апублікаваных пасля смерці гісторыка ў 1938 – 1939 гадах, А.Е. Праснякоў адмовіўся ад ранейшых поглядаў і вярнуўся да фармалізаваных схем яго папярэднікаў [15].

Значнай падзеяй у гістарыяграфіі Беларусі стала праца **У.М. Ігнатоўскага *“Кароткі нарыс гісторыі Беларусі”***, якая напісана з нацыянальных пазіцый. У ёй даволі падрабязна характарызуецца гісторыя Беларусі ў “полацкі перыяд” ІХ – ХІІІ стагоддзяў. Полацкае княства ў гэтай працы разглядаецца як асобнае княства, якое мае статус незалежнай дзяржавы ў палітычных, эканамічных і культурных адносінах. Каб вызначыць гэты асобны статус княства ў параўнанні з астатнімі землямі Старажытнай Русі, аўтар выкарыстоўвае назву *“Полацкая Русь”* [17], тым самым ён супрацьпастаўляе *“Русь Полацкую” “Русі Кіеўскай”*. У разглядзе падзей *“данарманскага”* перыяду (да 862 г.) Ігнатоўскі выказвае думку, што да летапіснага запрашэння варагаў у Полацку існавала свая крывіцкая дынастыя князёў [17, с. 34]. Даследчык пры разглядзе пытання пра арганізацыю ўлады ў Полацкім княстве ў адносінах да князя і веча пазначае наступнае: “*князь быў прадстаўніком мясцовай родапляменнай знаці і быў, такім чынам, элементам мясцовым. Кожная воласць кіравалася з боку ўстаноўча-заканадаўчага – вечам, а з боку выканаўчага – князем”* [17, с. 34]. Гісторык Ігнатоўскі – адзін з першых беларускіх навукоўцаў, які дакладна вызначыў нацыянальную накіраванасць сваіх прац і паказаў, што беларускі народ – гэта не толькі аб’ект гісторыі, залежны ад волі суседніх народаў, але і творца сваей гісторыі, гаспадар свайго лёсу.

Савецкая гістарыяграфія выпрацавала некалькі новых падыходаў наконт генезісу ўсходнеславянскай дзяржаўнасці. Найбольшае распаўсюджанне атрымала думка, згодна з якой Старажытнаруская дзяржава з’яўлялася прадуктам класавага грамадства, сфарміравалася ў форме раннефеадальнай манархіі, а ў ХІІ стагоддзі распалася на незалежныя або паўзалежныя княствы [18]. Калі ў дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі, у прыватнасці ў працах В.І. Сергеевіча, існавала думка, што княжацкая ўлада з’яўлялася народнай уладай, а князь быў органам веча і абшчыны, то ў савецкай гістарыяграфіі сцвярджалася, што князь быў прадстаўніком улады старажытнарускай знаці, абараняў яе класавыя інтарэсы. Гісторыя старажытнарускіх княстваў ХІ – ХІІ стагоддзяў прадстаўлена як гісторыя феадалізма на землях Усходняй Еўропы, а дзяржаўны лад разглядаўся як раннефеадальная манархія, дзе, на думку **Б.Д. Грэкава**, князь ажыццяўляў перш за ўсе інтарэсы баярскага класа [18]. Грэкаў распрацаваў феадальную канцэпцыю грамадскага развіцця ўсходніх славян у ІХ – ХІІІ стагоддзях. У сваіх працах ён даказваў, што ва ўсходніх славян, як і ў германцаў, разлажэнне першабытнаабшчыннага ладу прывяло да развіцця феадальных адносін. Таму ў VI – VIII стагоддзях панаваў дафеадальны лад, а ў ІХ – пачатку ХІІ – феадальны. Гісторык сцвярджаў пра далучэнне Полацка да Кіева князем Уладзімірам у 980 годзе, пра аўтаномію Полацкай зямлі і пачатак барацьбы з Кіевам пры князе Брачыславе Усяславічы [18].

Гісторыя западных зямель Старажытнай Русі з выкарыстаннем пісьмовых крыніц і даных археалогіі выкладзена маскоўскім гісторыкам і археолагам **Л.В. Аляксеевым** у грунтоўнай манаграфіі **“*Полоцкая земля в IX – XIII вв.: Очерки истории Северной Белоруссии*”** [19]. Гісторыя зямель Смаленскага княства прадстаўлена ў працы **“*Смоленская земля в IX – XIII вв.: Очерки истории Смоленщины и Восточной Белоруссии*”** [20].

Даследчык Л.В. Аляксееў пагаджаўся са скандынаўскім паходжаннем першага вядомага полацкага князя Рагвалода, адзначаючы, што Рагвалод захапіў Полацк у 60 – 70 гады Х стагоддзя, нягледзячы на тое, што крыніцы не пацвярджаюць укняжэнне Рагвалода ў Полацку шляхам яго захопу. Гісторык прапанаваў сваю версію ажыццяўлення ўлады Усяславам Брачыславічам у час яго кіеўскага княжэння: “*Нам важно, что в период киевского княжения Всеслав Полоцкий был полновластным великим князем, судившим и рядившим в своих новых владениях по своему усмотрению*” [19, с. 248].

Зыходзячы з паведамленняў летапісаў, Л.В. Аляксееў вызначае свой погляд на размеркаванне ўдзелаў пасля смерці Усяслава Полацкага паміж яго сынамі, вызначае асноўныя напрамкі палітычнай арыентацыі полацкіх князёў. На яго думку, сын Усяслава, менскі князь Глеб, з’яўляўся актыўным членам антыманамахаўскай партыі, з главой якой – Сятаполкам Ізяславічам – яго звязвалі роднасныя сувязі праз жонку.

Аналізуючы палітычную гісторыю Полаччыны ў перыяд феадальнай раздробленасці, даследчык адзначыў, што ўключэнне Полацкай зямлі ў агульнарускую палітыку ХІІ стагоддзя прыводзіць да палітычнай залежнасці полацкіх князёў ад розных паўднёварускіх палітычных партый [19, с. 252].

Гісторык звярнуў увагу на асаблівасці княжацкіх імён. Ён вызначыў, што князі давалі імёны сваім сынам не выпадкова, што асабліва адлюстравалася ў ХІІ стагоддзі. У гэты час драбленне Старажытнай Русі на ўдзелы выклікала барацьбу за княжэнне, у якім патрабавалася паказаць прамое паходжанне ад тых ці

іншых продкаў. Кожны княжацкі род меў тады сваю групу характэрных імен. Не быў у гэтым сэнсе выключэннем і род полацкіх Ізяславічаў [19].

Вучоны прапанаваў свой погляд на паведамленні В.Н. Тацішчава наконт падзей полацкай гісторыі. Паведамленне аб наведванні Уладзімірам Манамахам Смаленска з мэтай "*рассмотрения несогласий и усмирения полоцких князей*", якое Тацішчаў адносіць да 1121 года, Л.В. Аляксееў атаясамляе як васальную залежнасць князёў Полацкай зямлі ад Уладзіміра Манамаха [19, с. 258]. Трэба адзначыць, што акрамя звестак В.Н. Тацішчава, гэтае паведамленне нідзе не згадваецца, таму яе гістарычная даставернасць выклікае сумненні [21]. Такім чынам, Л.В. Аляксееў, разглядаючы ўзаемаадносіны паміж полацкімі і кіеўскімі князямі ў першай палове XII стагоддзя, характарызуе іх як адносіны васалітэта – суверынітэта. На яго думку, пасля перамог кааліцый паўднёварускіх князёў і рабавання Полацкай зямлі пытанне аб кандыдаце на княжацкі стол у Полацку залежыла ад раскладу дамоўленасці паміж княжацкімі групоўкамі Вольгавічаў і Манамахавічаў, але князь у Полацку павінен быць мясцовым, бо даследчык адзначае, што немясцовыя князі ніколі доўга ў горадзе не затрымліваліся [19].

Падзеі сярэдзіны XII стагоддзя, калі ў Полацку актыўна праяўляе сябе веча, Л.В. Аляксееў разглядае як супрацьстаянне Расціслава з баярствам, якое ўзначальвала вечавыя сходы і было ў саюзе з прадстаўнікамі царквы [19]. Аналізуючы палітычную гісторыю Полаччыны другой паловы XII стагоддзя, гісторык адзначае залежнае становішча полацкіх князёў ад палітычных груповак паўднёварускіх князёў, раскол Полацкага княства на асобныя часткі са сваімі спадчыннымі князямі і далейшае ўзмацненне феадальнай раздробленасці ў Полацкай зямлі з паступовым падпарадкаваннем яго Літве [19].

У кнізе "Смоленская земля в IX – XIII вв.: Очерки истории Смоленщины и Восточной Белоруссии", даследуючы сацыяльна-палітычную структуру Смаленскай зямлі, аўтар адзначае, што смаленскі князь Расціслаў Мсціславіч, не жадаючы драблення княства, як у Полацкай зямлі, вылучыў сыноў Рурыка і Давыда, даўшы ім княжацкія валоданні ў Паўднёвай Русі, а Смаленск атрымаў старэйшы сын Расціслава, Раман. Такім чынам, Расціславу на пэўны час удалося захаваць адзінства Смаленскай зямлі [20].

Аналізуючы асноўныя функцыі князя ў Смаленскай зямлі, Л.В. Аляксееў вылучае яго дыпламатычную дзейнасць. Князь прадстаўляе вышэйшую судовую інстанцыю (у тым ліку сямейнае і шлюбнае права), таксама ў кампетэнцыю князя ўваходзілі ўсе цяжбы з іншаземцамі. Акрамя судовай дзейнасці, асноўным абавязкам князя з'яўлялася ваенная справа. У функцыі князя ўваходзіў збор апалчэння, але тут Аляксееў пагаджаецца з П.В. Галубоўскім у тым, што князі рабілі гэта згодна з дынастычнымі меркаваннямі, і апалчэнне магло князя не падтрымаць [20].

Даследуючы ўзаемаадносіны князя і веча, Л.В. Аляксееў не пагаджаецца з П.В. Галубоўскім у пытанні ролі і функцый гэтага органа ўлады ў перыяд першай паловы XII стагоддзя. На думку маскоўскага гісторыка, у перыяд Расціслава веча яшчэ не было моцным, і яно не вырашала пытанняў аб заснаванні епіскапіі ў Смаленску. Таксама яно не выконвала заканадаўчыя функцыі, як гэта сцвярджаў П.В. Галубоўскі. Паводле Л.В. Аляксеева, веча ў Смаленску набірае моц у другой палове XII стагоддзя і з гэтага часу падзяляе разам з князем вярхоўную ўладу ў княстве [20].

У 2006 годзе была выдадзена грунтоўная праца Л.В. Аляксеева ***"Западные земли домонгольской Руси"***, у якой абагульняюцца дасягненні рускай і беларускай археалогіі ў вывучэнні гісторыі заходіх зямель Старажытнай Русі IX – XIII стагоддзяў. Аналіз археалагічных і пісьмовых крыніц дазваляе вылучыць асаблівую дружынную стадыю, якая звязана са станаўленнем княжацкай улады – *"гнёздовский этап Руси"*. Гэтая стадыя абумовіла ў заходнерускіх землях параўнальна ранняе развіццё дзяржаўнасці з характэрнымі рысамі эканомікі і культуры [22; 23].

Вялікае значэнне для развіцця гістарычнай навукі ў даследаванні беларускіх зямель ранняга сярэднявечча зрабіў **Г.В. Штыхаў**. У сваёй першай грунтоўнай манаграфіі ***"Древний Полоцк: IX – XIII вв."*** аўтар вызначае асноўныя функцыі князя і яго сувязь з дружыннай арганізацыяй [24]. У працы ***"Города Полоцкой земли"*** даследчык характарызуе перыяд станаўлення дзяржаўнай улады ў Полацкай зямлі IX – XI стагоддзяў як дружынны перыяд, адзначаючы, што першыя летапісныя "княжения" палачан узыходзяць да палітычных арганізацый эпохі ваеннай дэмакратыі [25]. Штыхаў вылучае адну з гіпотэз узнікнення гарадоў у Падзвінні як вынік працэсу каланізацыі і ўсталявання даніны ў гэтым рэгіёне. Гарады, на думку Г.В. Штыхава, з'яўляліся цэнтрам збора даніны і яе размеркавання. Згодна з гісторыкам, кіруе гэтым працэсам князь з дапамогай сваёй дружыны [25].

Даследуючы ролю веча ў палітычным жыцці, на думку Г.В. Штыхава, з канца 20-х гадоў XII стагоддзя князь ў Полацку запрашаўся вечам, і княжацкая ўлада была значна абмежавана ў сваім аб'ёме і функцыях. Узмацненне веча сведчыць аб адасабленні Полацка ад астатніх зямель Старажытнай Русі [24]. Аналізуючы ролю і функцыі княжацкай улады ў грамадска-палітычным жыцці княства, вучоны робіць слушную выснову аб існаванні ў Полацку абрада насталавання князя – прыкмета набыцця князем стала. *"Важной особенностью выборности князя в Полоцке середины XII вв.,* – адзначае Г.В. Штыхаў, *является ограничение выбора узким кругом полоцкой линии князей"* [24, с. 16].

Гісторык вызначыў значэнне летапіснага паняцця “волость”, атаясамліваючы яго з паняццем “власть”: “в X веке *"власть (волость) в Полоцке" и "Полоцкая земля" – понятия равнозначные”* [25, с. 28]. На яго думку, “волостью” называлася тэрыторыя, якая знаходзілася пад чыёй-небудзь уладай, адзначаючы, што тэрмін “князя волость” ужываўся для абазначэння тэрыторыі асобных княстваў [25].

У працы “Древний Полоцк: IX – XIII вв.” гісторык падрабязна прааналізаваў узаемаадносіны князя і веча. На яго думку, веча ажыццяўляла кантроль за дзейнасцю князя і здзяйсняла вышэйшы суд. Але пры ўсіх супярэчнасцях і канфліктах, якія існавалі паміж двума органамі палітычнай улады, даследчык лічыць, што веча абмяжоўвала княжацкую ўладу, але не знішчала яе [24]. Параўноўваючы арганізацыю ўлады ў Полацкім і Наўгародскім княствах, на думку гісторыка, у Полацку, у адрозненне ад Ноўгарада, не склалася спрыяльных умоў для ліквідацыі княжацкай улады: *“Существование особого полоцкого князя было обязательным и традиционным условием государственного устройства Полоцка”* [24, с. 20]. Навуковец Г.В. Штыхаў меў рацыю, калі лічыў, што полацкае веча не мела развітага інстытута прадстаўнічай улады, каб існаваць без князя, што абумоўлівала палітычны дуалізм у княстве [24].

Даследаваннем гісторыі і культуры Тураўскай зямлі IX – XIII стагоддзяў займаецца гісторык і археолаг **П.Ф. Лысенка**. У працах ***“Дреговичи”***, ***“Туровская земля”***, ***“Древний Туров”***, ***“Города Туровской земли”*** ён падрабязна асвятляе этнічную гісторыю Тураўскай зямлі, фарміраванне яе тэрыторыі, матэрыяльную і духоўную культуру, палітычную гісторыю і грамадскі лад. Разглядаючы палітычную гісторыю тураўскага княства, вучоны выказвае думку, што княства склалася ў канцы X стагоддзя і захоўвала сваё значэнне ў XI стагоддзі [26]. Гісторык прааналізаваў працэс станаўлення і развіцця дзяржаўнай улады ў Тураўскім княстве ад племяннога “княжения” дрыгавічоў да часоў феадальнай раздробленасці.

Згодна з летапісным паведамленнем аб самастойным племянным княжанні дрыгавічоў, П.Ф. Лысенка робіць выснову, што гэта племя належала да найбольш развітых у сацыяльна-эканамічнх адносінах плямён усходняга славянства. Ён адзначае вылучэнне сацыяльнай вярхушкі і адзінаўладных племянных князёў у дрыгавічоў, якія, магчыма, ужо мелі спадчынную дынастычную ўладу [27]. Працэс замены племянных княжанняў феадальнымі княствамі, які канчаткова адбыўся ў форме адміністрацыйнай рэформы кіеўскага князя Уладзіміра Святаславіча, змяніў грамадска-палітычнае развіццё ў дрыгавіцкім племянным саюзе. Фарміраванне княжацкай улады адбывалася на падставе новай феадальнай структуры грамадства з фарміраваннем сталай дынастычнай улады князя [26]. Такім чынам, гісторык вылучае ў ранняй палітычнай гісторыі тураўскай зямлі два этапы. Першы звязаны з гісторыяй княства дрыгавічоў. У другі перыяд, які пачынаецца ў сярэдзіне X стагоддзя, дрыгавічы апынуліся ў межах уплыву кіеўскага князя. Гісторык лічыць, што прызначэнне на тураўскі прастол старэйшага прыёмнага сына Уладзіміра Святаполка азначала высокую годнасць Тураўскай зямлі сярод іншых зямель Кіеўскай Русі, а сепаратыскія імкненні Святаполка сведчылі аб высокай ступені сацыяльна-эканамічнай самастойнасці Тураўскага княства [28].

У разглядзе палітычнай гісторыі Тураўскай зямлі ў XII – XIII стагоддзях П.Ф. Лысенка робіць выснову аб своеасаблівасці гэтага княства ў сістэме княстваў Кіеўскай Русі. Вялікае значэнне тураўскага княства тлумачыцца яго прыналежнасцю старэйшай лініі Яраславічаў і той акалічнасцю, што менавіта з Тураўскага княства тураўскія князі пераходзілі на кіеўскі вялікакняжацкі стол [26]. Пасля ўмацавання на кіеўскім прастоле Усевалада Вольгавіча змянілася становішча Тураўскага княства. Да гэтага часу, калі ім кіравалі Манамахавічы, княства захоўвала сваю цэласнасць у складзе Кіеўскай Русі. Пры Усеваладзе Вольгавічы пачаўся перыяд яго драблення [26]. Гісторык робіць выснову, што ў Тураве з другой паловы XII стагоддзя сфарміравалася кола мясцовай знаці, якая аказвала значны ўплыў на становішча вышэйшай улады [26]. Аналізуючы падзеі, якія звязаны з аднаўленнем самастойнасці Тураўскага княства, П.Ф. Лысенка адзначае, што “*перарванае Уладзімірам Манамахам у 1113 г. самастойнае палітычнае развіццё Тураўскага княства праз пакуты часовых падараванняў і драбленняў у 40 – 50-я гг. было адноўлена ў 1157 г. дзякуючы рашучасці і мужнасці нашчадка Ізяславічаў Юрыя Яраславіча, гарачай і адданай падтрымкі тураўскага насельніцтва*” [28, с. 193]. Так была адноўлена адносная самастойнасць тураўскага княства і дынастыя Ізяславічаў. Лысенка, даследуючы палітычнае жыццё Тураўшчыны падчас драблення княства на асобныя ўдзелы, адзначыў мірныя адносіны князёў Юр’евічаў. На яго думку, гэта было неабходнай умовай захавання імі пэўнай самастойнасці і незалежнасці [26].

У даследаванні станаўлення дзяржаўнасці на землях Старажытнай Русі рэвалюцыйную значнасць мелі працы санкт-пецярбургскага гісторыка **І.Я. Фраянава**. Гісторык асаблівую ўвагу звяртаў на даследаванне палітычных інстытутаў на ўсходнеславянскіх землях, падрабязна разглядаў такія структуры ўлады, як князь, дружына, веча. Канцэпцыя гісторыі Старажытнай Русі І.Я. Фраянава адмаўляе існаваўшыя погляды марксісцкай гістарыяграфіі на прыроду і сутнасць дзяржаўнай улады і ўтрымлівае элементы цывілізацыйнага падыходу. Генезіс дзяржаўнасці ў працах даследчыка прадстаўлены як працяглы працэс станаўлення асноўных яе прызнакаў, які адбываўся на працягу VI – XII стагоддзяў. Фраянаў падзяляе гісторыю дамангольскай Русі на два асноўныя перыяды. Перыяд зараджэння і станаўлення дзяржаўнасці на ўсходнеславянскіх землях (VII – X стст.) звязаны з існаваннем племянных саюзаў. У Кіеўскай Русі VII – X стагоддзяў гісторык бачыць грандыёзны суперсаюз плямёнаў з цэнтрам у Кіеве. Асноўнымі элементамі дзржаў-

най улады ў гэты перыяд з’яўляліся публічная ўлада і падаткаабкладанне ў выглядзе даніны [29]. Па меркаванні І.Я. Фраянава, у працэсе зараджэння дзяржаўнасці ўлада князя была цесна звязана з ваеннай сілай. Улада належала таму, хто прадстаўляў сабою ваенную моц. У X – XI стагоддзях існавала адносная раўнавага палітычных сіл паміж князем і вечам. Улада князя абапіралася на падтрымку дружыны, за вечам стаяла ваенная арганізацыя гараджан [29].

Старажытная Русь XI – XIII стагоддзяў, на думку даследчыка, уяўляла сабой гарады-дзяржавы, якія сфарміраваліся на аснове былых племянных саюзаў і мелі дакласавы характар [29]. Канчаткова канцэпцыя гарадоў-дзяржаў была аформлена ў сумеснай працы І.Я. Фраянава і А.Ю. Дварнічэнкі ***“Города – государства Древней Руси”*** [30]. У XI – XIII стагоддзях улада князя цесна звязана з абшчынай. На думку І.Я. Фраянава, князь, прымаючы ўладу ў воласці, уваходзіць у пагадненне з вечам і прымае ўмовы, якія ставяць яго ў пэўныя рамкі: *“Князь заключал ряд с народным собранием – вечем. А это значит, что он превращался в известном смысле в общинную власть, призванную блюсти интересы местного общества”* [29, с. 142]. Менавіта ў гэты перыяд адбываецца станаўленне трэцяга прызнака дзяржаўнасці – размяшчэнне насельніцтва па тэрытарыяльнаму прынцыпу. З гэтага вынікае, што працэс станаўлення дзяржавы ў Старажытнай Русі ў асноўных яе рысах быў завершаны. Такім чынам, гісторык сцвярджаў, што Кіеўская Русь з’яўлялася дзяржавай дакласавай – “потестарной”. Гэта заключэнне заснавана на трох асноўных прынцыпах, якія лічацца паказчыкам завершанасці палітагенезу і фарміравання дзяржавы: наяўнасць публічнай улады, аддзеленай ад асноўнай масы насельніцтва, спагнанне падаткаў для ўтрымання публічнай улады і размяшчэнне насельніцтва па тэрытарыяльным прынцыпе, а не на аснове крэўных сувязяў, як гэта было пры старай родавай арганізацыі.

Гістарычная канцэпцыя І.Я. Фраянава аб развіцці дзяржаўных працэсаў на землях Старажытнай Русі аказала значны ўплыў на далейшую распрацоўку гэтага пытання. На падставе канцэпцыі існавання гарадоў-дзяржаў і дакласавым характары старажытнарускіх зямель сфарміравалася плеяда гісторыкаў, якія развівалі асноўныя палажэнні новай канцэпцыі па матэрыялах асобных рэгіёнаў дамангольскай Русі.

У дадзенай рабоце нельга абыйсці ўвагай манаграфію ўкраінскага гісторыка **П.А. Талочка** ***“Князь в Древней Руси: власть, собственность, идеология”***, якая ўпершыню пасля кнігі А.Е. Праснякова (1909 г.) падрабязна асвятляе сістэму міжкняжацкіх адносін у дамангольскай Русі [31]. Акрамя даследавання станаўлення і характару княжацкай улады і міжкняжацкіх адносін, гісторык падрабязна разглядае ўяўленні аб княжацкай уладзе ў старажытнарускім грамадстве.

Аналізуючы тэрміналогію летапісных крыніц, аўтар прыйшоў да высновы, што паняцці “земля” і “волость” у кантэксце распаўсюджання княжацкай улады маюць рознае значэнне. “Волость”, на думку гісторыка, – гэта неадчужаемая, умоўная зямельная ўласнасць, аналагічная заходнееўрапейскаму бенефіцыю, а “земля” – гэта тэрыторыя, на якую распаўсюджваецца дзяржаўная ўлада князя, не заўсёды супадаючая з яго ўладальніцкімі правамі [31]. Разглядаючы ключавое пытанне работы аб праблеме міжкняжацкіх адносін, гісторык адзначае неўрэгуляванасць наследавання кіеўскага стала. Асновай міжкняжацкіх адносін на Русі, паводле А.П. Талочкі, з’яўляецца паняцце “*родового сюзеренитета*”, калі ўся тэрыторыя Кіеўскай Русі з’яўляецца калектыўным валоданнем рода Рурыкавічаў [31]. У гэтым кантэксце выключэннем з’яўляецца Полацкая зямля, на якую ў XI – XII стагоддзях улада кіеўскіх князёў амаль не распаўсюджвалася. На думку А.П. Талочка, “*система старейшинства*” першапачаткова існавала на Русі, што супярэчыць гіпотэзам іншых гісторыкаў [14]. Паводле **А.В. Назарэнкі**, уяўленні аб старэйшынстве як заключнай фазе “родового сюзеренитета” пачынаюцца з “ряда Ярослава” (сярэдзіна XI ст.) [32, с. 173].

У главе, прысвечанай ідэалогіі княжацкай улады, аўтар у асобных раздзелах закранае такія пытанні, як “Доктрина коллективной власти Рюриковичей”, “Старейшинство”, “Отчина” [31, с. 64 – 102]. Асаблівую ўвагу аўтар надае пытанню “*идеи империи*” і старажытнарускім уяўленням аб суверэнітэце княжацкай улады [31]. На думку гісторыка, у перыяд княжэння Яраслава Уладзіміравіча imitatio imperii зводзілася да капіявання канстантынопальскіх звычаяў і з’яўлялася своеасабовай формай адмаўлення ідэі сусветнай улады канстанцінопальскага імператара. У сувязі з далейшым уплывам хрысціянізацыі адбываюцца адваротныя працэсы ўспрыняцця візантыйскіх традыцый і іх перанясення на старажытнарускую глебу [31]. Аўтар звяртае ўвагу на тытулатуру і атрыбутыку княжацкай улады. У летапісным тэрміне “великий князь” гісторык бачыць не тытул ва ўласным сэнсе слова, а стылістычны прыём, побач з іншымі ўзорамі кшталту “благоверный князь”, “христолюбивый князь” і да т.п. [31]. Спыняючыся на праблеме старажытнарускіх атрыбутаў княжацкай улады і абраду інтранізацыі, П.Ф. Талочка лічыць, што ў Старажытнай Русі існаваў дастаткова дыферэнцыраваны абрад насталавання кіеўскіх князёў, які ўключаў у сябе ўрачыстую сустрэчу князя пад сценамі горада і ўзвядзенне яго на стол у саборы св. Сафіі [31].

Кніга А.П. Талочкі каштоўная ў даследаваннях узаемаадносін паміж князямі ў пытаннях улады ў Кіеўскай Русі і спадчыннага права. Але гісторык разглядае феномен княжацкай улады выключна скрозь прызму міжкняжацкіх адносін, не закранаючы пытанні развіцця княжацкай улады ў палітычнай структуры старажытнарускіх зямель і адносіны паміж князем і асобнымі сацыяльнымі інстытутамі.

Значны ўплыў на метадалагічную распрацоўку і далейшае даследаванне працэсаў зараджэння і станаўлення дзяржаўнасці на ўсходнеславянскіх землях аказаў артыкул **Е.А. Мельнікавай**, прысвечаны тыпалогіі раннедзяржаўных утварэнняў у Паўночнай і Усходняй Еўропе [33], якая выступіла супраць усталяванага ў савецкай гістарыяграфіі погляду на зараджэнне дзяржаўнасці як працэсу ўтварэння класаў і феадальнай фармацыі. На яе думку, паступовы пераход ад родавага да класавага (феадальнага) грамадства ва Усходняй і Паўночнай Еўропе ажыццяўляўся праз некалькі паслядоўных тыпаў сацыяльна-палітычных сістэм: “вождийство”, “дружинное государство” і раннефеадальная дзяржава [33].

Першы тып сацыяльна-палітычнай арганізацыі з’яўляецца яшчэ дадзяржаўным утварэннем са значным уплывам племяннои эліты. Для гэтага перыяду характэрна распаўсюджванне ўлады і ўключэнне ў свой склад іншых плямёнаў на аснове канфедэрацыі, заваёвы або падпарадкаванне ў форме абкладання данінай, што суправаджалася значным павелічэннем прыбавачнага прадукту. У гэтых умовах няроўнасць сацыяльных статусаў у доступе да выкарыстання і прысваення залішняга прадукту выклікала нарастанне сацыяльнай і маёмаснай дыферэнцыяцыі [33]. У *“дружинном государстве”*, паводле Е.А. Мельнікавай, патэстарныя структуры прадстаўлены ваеннай арганізацыяй. Галоўнай асаблівасцю палітычнай сістэмы гэтага ўтварэння з’яўляецца прыналежнасць вярхоўнай улады ў грамадстве яе ваенізаванай частцы – дружыне на чале з князем. Менавіта дружына, згодна з Е.А. Мельнікавай: *“образует органы управления центральной власти, еще примитивные и слабо расчлененные”* [33]. Даследчык адзначае, што ў фарміраванні раннефеадальных дзяржаў нельга вылучаць толькі адзін фактар, які паўплываў на развіццё дзяржаватворчых працэсаў і з’яўляўся прычынай утварэння дзяржаўнасці. На яе думку, асноўнымі фактарамі, так ці інакш паўплываўшымі на ўтварэнне раннефеадальнай дзяржавы на землях усходніх славян, былі вытворчая гаспадарка, вайна і гандаль па рачных камунікацыях Усходняй і Паўночнай Еўропы з арабскім светам і Візантыяй [33].

Даследаванню інстытута княжацкай улады на ўсходнеславянскіх землях у VI – XIII стагоддзях прысвечана манаграфія пецярбургскага гісторыка **М.Б. Свярдлова** [34]. Вучоны пры паслядоўным выкарыстанні сістэмна-структурнага і генетычнага метадаў у гістарычным даследаванні прааналізаваў вытокі княжацкай улады на землях Усходняй Еўропы. На думку даследчыка, праблема аналіза грамадска-палітычных структур старажытнарускага перыяду павінна разглядацца як генетычны працяг сацыяльных інстытутаў індаеўрапейскай цывілізацыі [34].

Аналізуючы грамадскі лад славян у VI – VII стагоддзях, вучоны раскрывае ў ім месца і значэнне ўлады князя ў параўнанні з агульнаіндаеўрапейскім перыядам і вызначае яе змест як далейшае развіццё інстытутаў улады ў славянскім свеце. Пры гэтым даследчык асаблівую ўвагу надае параўнальна-гістарычным дадзеным. Выкарыстоўваючы параўнальна-гістарычныя матэрыялы сінхрастадыяльных грамадстваў, ён параўноўвае характар вярхоўнай улады ў старажытных германцаў і славян. Гісторык прыйшоў да высновы, што ў познім племянным грамадстве (VI – VII стст.) князь абіраўся на народным сходзе для кіравання племенем. Такое абранне, на думку даследчыка, працягвала агульную індаеўрапейскую традыцыю. Абраць князем маглі толькі чалавека знатнага роду. Князь станавіўся главой племені, але яго ўлада была абмежавана саветам старэйшын і народным сходам [34].

Эканамічнае і сацыяльна-палітычнае становішча, у якіх адбывалася далейшае станаўленне інстытута княжацкай улады ў VIII – IX стагоддзях, істотна змяняюцца. Агульныя змены звязаны з шырокім рассяленнем усходнеславянскіх плямёнаў. На працэсы ўтварэння міжплемянных саюзаў і племянных “княжений”, а таксама на структуры ўлады паўплываў эканамічны фактар, які быў звязаны з сістэмай водных камунікацый: Волхаўска-Волжскім і Балтыйска-Чарнаморскім гандлёвымі шляхамі. Менавіта гэты фактар, як адзначае М.Б. Свярдлоў, паўплываў на ўтварэнне племяннога княжэння славен, пскоўскіх крывічоў і фіна-вугорскага племені меры [34]. Адзначаючы свой погляд адносна інтэрпрэтацыі летапіснага сказання аб запрашэнні варагаў, даследчык лічыць яго адлюстраваннем акта абрання князя, якое ўзыходзіла да старажытнай традыцыі славян на апошняй стадыі племяннога ладу і сведчыла аб пачатку дзяржаватворчых працэсаў на ўсходнеславянскіх землях [34]. У кантэксце размеркавання гарадоў Рурыка сваім мужам М.Б. Свярдлоў асаблівую ўвагу надае Полацку. Вучоны адзначае, што згадванне Полацка і Растова ў Сказанні магло быць адлюстраваннем гістарычнай памяці як трансфармаванае сведчанне аб асноўных напрамках ваенна-палітычнай экспансіі Рурыка і Алега. Ён пагаджаецца з Л.В. Аляксеевым у тым, што горад мог быць захоплены Рагвалодам у 60-я гады X стагоддзя падчас балканскіх паходаў кіеўскага князя Святаслава Ігаравіча [34].

Рэформы княгіні Вольгі ў другой палове X стагоддзя па замене племяннога падзелу на тэрытарыяльны вызначылі ўтварэнне дзяржавы з асноўнымі палітычнымі інстытутамі. У гэты перыяд зніклі ранейшыя племянныя органы ўлады – савет старэйшын і народны сход. У выніку адбываецца далейшая канцэнтрацыя і ўзмацненне ўлады князя і ўсталяванне ў Старажытнай Русі X – першай палове XI стагоддзя раннефеадальнай манархічнай княжацкай улады [34]. Асноўны прынцып княжацкага атрымання ў спадчыну па прамой сыходнай мужчынскай лініі стаў, на думку М.Б. Свярдлова, асноўнай прычынай міжкняжацкіх сутыкненняў у перыяд дынастычных крызісаў, якія вялі да феадальнай раздробленасці. Сярод яе

асноўных прычын даследчык вылучыў наступныя: 1) распаўсюджванне бацькоўскага ўладання княствамі і, як вынік, фарміраванне мясцовых княжацкіх дынастый; 2) рост мясцовых землеўладальнікаў; 3) эканамічная і сацыяльная эвалюцыя гарадоў, якая вяла да аўтаномнасці ад княжацкай улады [34]. У гэтых умовах, па меркаванні М.Б. Свярдлова, асаблівае значэнне набывае суб'ектыўны фактар – мера таленту князя як палітычнага кіраўніка.

Даследуючы працэсы развіцця інстытута княжацкай улады ў другой палове XII – першай трэці XIII стагоддзя, вучоны адзначае ўсталяванне на прасторы Старажытнай Русі трох розных сістэм: 1) княжацкай манархічнай улады (якая была ўласціва для Паўночна-Усходняй, Паўднёва-Усходняй і Заходняй Русі); 2) Наўгародскай баярскай рэспублікі з выбарнымі органамі гарадскога кіравання; 3) тэрыторыі Паўднёва-Заходняй і Паўднёвай Русі, дзе на палітычны працэс уплывалі як інстытут княжацкай улады, так і баярская арыстакратыя. Даследчык адзначае, што ў княствах перыяду феадальнай раздробленасці да першай трэці XIII стагоддзя князі захавалі асноўныя функцыі вярхоўнай улады. Нават у Ноўгарадзе, дзе княжацкая ўлада была істотна абмежавана вечам, вялікае значэнне князя захоўвалася ў ваеннай і судовай справе [34].

У апошнія дзесяцігоддзі ў беларускай гістарычнай навуцы дыскутуецца пытанне аб пачатку дзяржаўнасці на беларускіх землях. Гісторыкі галоўную ролю ў дзяржаватворчых працэсах на тэрыторыі Беларусі адводзяць Полацкаму княству. Полацкае княства разглядаецца як дзяржава з усімі атрыбутамі незалежнасці. Пры гэтым у пастаянным імкненні да аўтаноміі ад Кіева полацкія князі, ад Брачыслава Ізяславіча да нашчадкаў Усяслава, вымушаны ўступаць з паўднёварускімі князямі ў ваенныя канфлікты. Як адзначае абсалютная большасць беларускіх гісторыкаў, полацкія князі ўсведамлялі Полаччыну сваёй спадчыннай зямлей і не мелі прэтэнзій на кіеўскі стол.

Альтэрнатыўны погляд на гэтае пытанне прадстаўляе **І.А. Марзалюк.** На яго думку, Кіеўская Русь – адзіная спадчына як для беларускіх княстваў, так і для астатніх зямель Русі. Як пазначае вучоны ў працы ***"Гістарычная самаідэнтычнасць насельніцтва Беларусі ў XI – XVII стст."***, у аснове канфлікту паміж Усяславам Полацкім і Яраславічамі ляжалі прэтэнзіі полацкага князя на кіеўскі "стол". Усяслаў з'яўляўся праўнукам кіеўскага князя Уладзіміра Святаславіча. З-за таго, што дзед Усяслава, Ізяслаў, памёр яшчэ пры жыцці свайго бацькі ў 1001 годзе і не княжыў у Кіеве, па спадчыннаму праву яго нашчадкі пазбаўляліся вялікакняжацкага стала ў Кіеве. Пацвярджэннем намаганням Усяслава здабыць кіеўскі пасад з'яўляецца сумеснае княжанне ў Кіеве яго бацькі Брачыслава і Яраслава Уладзіміравіча пасля 1021 года. Як адзначае даследчык: *"З'яўляючыся князем Полацкай зямлі і не маючы права прэтэндаваць на асобныя часткі Кіеўскай Русі, Усяслаў валодаў правам на вярхоўную ўладу ў ёй"* [35].

У працы І.А. Марзалюка прадстаўлена арыгінальная канцэпцыя, паводле якой Усяслаў Брачыславіч, пабудаваўшы Сафійскі сабор, выказваў такім чынам пэўныя прэтэнзіі на гегемонію свайго цэнтра ў Кіеўскай Русі [35]. Факт будаўніцтва Усяславам Сафійскага сабора сведчыць аб запазычанні гэтай ідэі і перанясення ідэі сакральнасці на полацкую прастору.

У гэтай сувязі погляды І.А. Марзалюка ў шэрагу пытанняў сугучны з поглядам расійскага гісторыка **І.Я. Данілеўскага**, які пазначае, што кожны з гарадоў, які прэтэндаваў на ролю цэнтра Рускай зямлі, аўтаматычна прымаў на сябе абавязак стаць "трэцім Рымам" і "Новым Іерусалімам". У сувязі з гэтым тут з'яўляліся і знешнія атрыбуты сталіцы свету: Залатыя вароты, новы цэнтральны храм і да т.п. [36]. Данілеўскі ў сваіх працах асвятляе "старажытнарускую дзяржаву" скрозь прызму тэалагічных пабудоў складальнікаў усходнеславянскіх летапісаў. Даследуючы герменеўтычныя асновы старажытнарускіх наратыўных крыніц, даследчык робіць высновы аб паралелях летапісных тэкстаў са Свяшчэнным Пісаннем [37]. Такім чынам, ён разглядае палітыка-ідэалагічныя рэаліі ранняга рускага сярэднявечча ў рэчышчы хрысціянскага светапогляду. Адзначаючы яго вялікі ўнёсак у даследаванне пісьмовых крыніц і новыя метады гістарычнага даследавання, трэба адзначыць яго перабольшванне хрысціянскай карціны свету ў светапоглядзе старажытнарускага грамадства, пры тым што значная маса насельніцтва XI – XII стагоддзяў захоўвала язычніцкае светаўспрыманне [38, с. 35]. Назвы асноўных прац даследчыка ***"Древняя Русь глазами современников и потомков (IX – XII вв.)"*** і ***"Древнерусские земли глазами современников и потомков (XII – XIV вв.)"*** [39; 40] хутчэй за ўсё адпавядаюць уяўленням інтэлектуальнай эліты Старажытнай Русі, якія, магчыма, з пункту погляду гісторыка з'яўляюцца яе "современниками".

Сярод прац апошніх гадоў варта адзначыць манаграфію беларускага гісторыка **С.М. Цемушава *"Начало Руси: генезис государственности в источниках и исторической традиции"*** [41]. У працы аўтар аналізуе комплекс пісьмовых і археалагічных крыніц па праблеме генезісу дзяржаўнасці на землях усходніх славян у IX – X стагоддзях. Даследчык, як і Е.А. Мельнікава, звязвае фарміраванне патэстарна-палітычных структур з пераразмеркаваннем залішняга прадукту, доступ да якога забяспечвае вылучэнне правадыроў і фарміраванне племяннай арыстакратыі. Таксама, згодна з Е.А. Мельнікавай, С.М. Цемушовым у перыядзе "вождества" атрыманне залішняга прадукту звязвае з трыма асноўнымі фактарамі: павелічэннем прадукцыйнасці працы, гандлёвай дзейнасцю і вайной. Менавіта апошні фактар даследчык лічыў найбольш выразным, ён ўзмацняў аўтарытэт правадыра [41]. На думку даследчыка, асноўным працэсам, які прывёў да ўтварэння дзяржавы, была сацыяльная дыферэнцыяцыя. Асноўнай яе перадумовай

было з'яўленне рэгулярнага прыбавачнага прадукту, які адрозніваўся ад залішняга: "*большей стабильностью и меньшей зависимостью от экологической обстановки*" [41, с. 82].

Падрабязна разглядаючы ролю скандынаўскага этнічнага элемента ў працэсе ўтварэння старажытнарускай дзяржавы, С.М. Цемушаў адзначае, што ва ўмовах міжплемянных сутыкненняў паміж славянамі і фіна-вугорскімі плямёнамі найбольш спрыяльнымі для добрага функцыянавання новай сацыяльнай сістэмы з'яўляюцца прадстаўнікі з іназтнічнага асяроддзя, якімі былі варагі [41].

Асвятляючы дзейнасць Алега, аўтар прыйшоў да высновы, што, захопліваючы гарады на шляху з "вараг у грэкі" і сажаючы там сваіх "мужей", Алег такім чынам даў пачатак арганізацыі апарата княжацкага кіравання гарадамі-цэнтрамі будучых валасцей. Адбываецца якасна новы ўзровень палітычнага развіцця вярхоўнай улады: фарміруецца дзяржаўны апарат кіравання, сістэма налогаабкладання, адбываецца ўсталяванне кадыфікаванага заканадаўства. Таксама змяняецца характар знешняй палітыкі, які забяспечваў эліце грамадства рынак збыту прадукцыі, спагнанай з падуладнага насельніцтва ў выглядзе даніны.

У асобным артыкуле, які прысвечаны заходне- і ўсходнеславянскім паданням аб узнікненні княжацкай улады, С.М. Цемушаў адзначае, што пры пэўных адрозненнях у крыніцах на акалічнасці ўтварэння новага палітычнага інстытута ў славянскіх пісьмовых помніках варта заўважыць агульныя моманты. Сярод іх даследчык вылучае паведамленні аб запрашэнні князя звонку як прадстаўніка іншага асяроддзя. Звяртае на сябе ўвагу агульнасць паведамленняў аб князе як гаранце ўнутранай стабільнасці і спакою ў грамадстве і вылучэнні галоўных функцый княжацкай улады [42].

Даследаванню генезіса і легітымізацыі княжацкай улады ў Старажытнай Русі прысвечана праца **В.А. Плотнікавай**. У сваім даследаванні аўтар робіць выснову аб расколе ў VIII – IX стагоддзях улады паміж калектыўным органам кіравання – саветам старэйшын і ўладай абраных мясцовых князёў, якія набіралі моц, падпарадкоўваючы сабе племя. У гэтай сувязі старэйшыны з мэтай паслаблення ўлады мясцовых князёў запрашаюць скандынаваў як сілу, якая істотна паслабіла, а затым і знішчыла інстытут мясцовых князёў. У выніку іншародная ўлада ўкаранілася на ўсходнеславянскай глебе [43].

Даследуючы эвалюцыю тытулатуры князёў, В.А. Плотнікава звярнула ўвагу на тое, што разам з фізічным знішчэннем мясцовых племянных князёў знікае тытул "светлый князь", а тытул "великий князь" становіцца дынастычным і звязаны з уладаннем Кіева [43]. Яна адзначыла, што канчатковае ўзвышэнне і легітымізацыя ўлады князя завяршаецца ў сярэдзіне XI стагоддзя, чаму садзейнічала прыняцце хрысціянства і атаясамленне княжацкай улады з уладай ад Бога. Даследчык адзначае вызначальную ролю храма св. Сафіі для працэсу легітымізацыі княжацкай улады. На падставе даследавання тэксталагічных паралелей вызначана атаясамленне гэтага храма з іншымі сусветнымі святынямі хрысціянства [43].

Падзел зямель Уладзімірам Святаславічам паміж сваімі сынамі, з пункту гледжання В.А. Плотнікавай, нельга разглядаць як пачатак афармлення васальных адносін на Русі. На думку даследчыка, надзяленне землёй сыноў вялікіх князёў Уладзіміра і Яраслава трэба разглядаць як: "*временное генетическое пожалование с правом управления*" [43]. Устаноўлена, што "ряд" Яраслава заклаў пачатак права вотчыны, замацаванага ў далейшым на Любецкім з'ездзе, з улікам таго, што ўжо да 1054 года прэтэндэнты на ўладу іншых ліній былі ліквідаваны [43].

У артыкуле, прысвечаным крысталізацыі інстытута княжацкай улады ў Старажытнай Русі, даследчык асобна звяртае ўвагу на спадчынны ўдзел полацкіх Ізяславічаў. У гэтай сувязі, параўноўваючы гісторыю радавога сюзерэнітэту франкаў і ўсходіх славян, яна знайшла тыпалагічна блізкія выпадкі. Так, нягледзячы на тое, што сын Карла Вялікага Піпін, кароль Паўночнай Італіі, пры жыцці бацькі пакінуў нашчадкаў, але памёр раней (810 г.), ягоныя нашчадкі заставаліся італьянскімі каралямі пад кіраваннем франкскага манарха. У сваю чаргу, з паўночнаітальянскімі ўладарамі В.А. Плотнікава параўноўвае полацкіх Ізяславічаў, якія не мелі права прэтэндаваць на кіеўскі пасад згодна з законамі радавога сюзерэнітэту, які назаўсёды выключыў нашчадкаў Ізяслава (які памёр раней за бацьку Уладзіміра) з прэтэндэнтаў на Кіеў [44].

Такім чынам, падводзячы вынік разгляду гістарыяграфіі інстытута княжацкай улады на беларускіх (усходнеславянскіх) землях, трэба адзначыць, што гісторыя станаўлення і развіцця дзяржаўнасці – аб'ект шматгадовых, складаных дыскусій. Тым не менш вопыт папярэдніх даследчыкаў дазваляе па-іншаму зірнуць на гэтую праблему. У розныя перыяды існавання расійскай і беларускай гістарычнай навукі, пачынаючы з XVIII стагоддзя і заканчваючы апошнімі гадамі XX стагоддзя, інстытут княжацкай улады разглядаўся пад рознымі пунктамі погляду ў залежнасці ад грамадскіх прыярытэтаў перыяду, у якім працавалі даследчыкі, яго сацыяльных, палітычных і эканмічных складнікаў.

У беларускай гістарыяграфіі перыяду IX – XIII стагоддзяў няма працы, якая б была асобна прысвечана праблеме генезісу і эвалюцыі княжацкай улады як асобнага палітычнага інстытута. У працах беларускіх даследчыкаў княжацкая ўлада, княжацкі апарат кіравання, веча разглядаліся як палітычныя інстытуты з яскрава вылучанымі і рэгламентаванымі функцыямі заканадаўчай і выканаўчай улады, што хутчэй адпавядае сацыяльна-палітычным рэаліям Новага часу, чым светапогляду і ўяўленням Чалавека сярэднявечча.

Новае даследаванне патрабуе прааналізаваць інстытут княжацкай улады ў яго ўзаемасувязі з іншымі сацыяльна-палітычнымі інстытутамі, прасачыць працэсы вылучэння ўлады князя ў родапляменным грамадстве, яе генезіс і эвалюцыю на працягу IX – першай паловы XIII стагоддзя. Пры даследаванні станаўлення і развіцця княжацкай улады трэба ўлічваць этнічныя, эканамічныя, палітычныя, культурна-рэлігійныя фактары. Важнае значэнне мае адлюстраванне працэсу станаўлення дзяржаўнай улады ў калектыўных і індывідуальных уяўленнях насельніцтва ўсходнеславянскіх зямель. Комплексны падыход у даследаванні дазволіць прааналізаваць феномен княжацкай улады на беларускіх землях у сумесным і арганічным функцыянаванні з сацыяльнымі інстытутамі ўсходнеславянскага грамадства.

ЛІТАРАТУРА

1. Татищев, В.Н. История Российская / В.Н. Татищев. – М.: Эксмо, 2006. – 736 с.
2. Штыхаў, Г.В. Сярэднявечная гісторыя Полацка і Полацкай зямлі (да канца XIII ст.) у расійскай гістарыяграфіі XVIII – пачатку XX ст. / Г.В. Штыхаў // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: матэрыялы IV міжнар. навук. канф. – Полацк: НПГКЗМ, 2003. – С. 314 – 319.
3. Карамзин, Н.М. История государства Российского: в 3-х кн. Кн. 1 / Н.М. Карамзин. – СПб.: Кристалл, 2000. – 704 с.
4. Дербин, Е.Н. Институт княжеской власти на Руси IX – начала XIII века в дореволюционной отечественной историографии / Е.Н. Дербин. – Ижевск: Издат. Дом "Удмуртский университет", 2007. – 268 с.
5. Беляев, И.Д. Рассказы из русской истории. История Полотска, или Северо-Западной Руси, от древнейших времен, до Люблинской унии, Ч. 1: [Строй жизни Полотска и ВКЛ]. / И.Д. Беляев. – М.: Синодальная тип., 1865. – 456 с.
6. Беляев, И.Д. Лекции по истории русского законодательства / И.Д. Беляев. – М.: Типо-Лит. С.А. Петровского и Н.П. Панина, 1879. – VIII, 728 с.
7. Соловьёв, С.М. Об истории древней России / С.М. Соловьёв. – М.: Просвещение, 1993. – 753 с.
8. Сергеевич, В.И. Древности русского права / В.И. Сергеевич. – М.: Зерцало, 2006. – Т. 2: Вече и князь. Советники князя. – 510 с.
9. Сергеевич, В.И. Лекции и исследования по древней истории русского права / В.И. Сергеевич. – 2-е изд., дополн. – СПб.: Тип. М.М. Стасюкевича, 1899. – VI, 480 с.
10. Довнар-Запольский, М.В. Очерк истории Кривической и Дреговической Земель до конца XII столетия / М.В. Довнар-Запольский. – Киев: Тип. Т-ва И.Н. Кушнерев и К в Москве. Киев. отд-ние, 1891. – 178 с.
11. Довнар-Запольский, М.В. Политический строй Древней Руси. Вече и Князь / М.В. Довнар-Запольский. – М.: Т-во М.А. Сытина, ценз. 1906. – 63 с.
12. Данилевич, В.Е. Очерки истории Полоцкой земли до конца XIV столетия / В.Е. Данилевич. – Тип. В.І. Завадского, 1896. – 260 с.
13. Голубовский, П.В. История Смоленской земли / П.В. Голубовский. – Киев: Тип. Имп. ун-та Св. Владимира. – 337 с.
14. Пресняков, А.Е. Княжое право в Древней Руси / А.Е. Пресняков. Подгот. текста ст. и примеч. М.Б. Свердлова. – М.: Наука, 1993. – 634 с.
15. Пресняков, А.Е. Лекции по русской истории / А.Е. Пресняков. – М.: Гос. соц.-экон. изд-во, 1939. – Т. 2: Западная Русь и Литовско-Русское государство. – 245 с.
16. Вилкул, Т.Л. Люди и князь в древнерусских летописях середины XI – XIII вв. / Т.Л. Вилкул. – М.: Квадрига, 2009. – 408 с.
17. Ігнатоўскі, У.М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі / У.М. Ігнатоўскі. – Мінск: Беларусь, 1992. – 190 с.
18. Греков, Б.Д. Киевская Русь / Б.Д. Греков. – М.: ООО "Издательство АСТ", 2003. – 578 с.
19. Алексеев, Л.В. Полоцкая земля (очерки истории Северной Белоруссии) в IX – XIII вв. / Л.В. Алексеев. – М.: Наука, 1966. – 296 с.
20. Алексеев, Л.В. Смоленская земля в IX – XIII вв. / Л.В. Алексеев. – М.: Наука, 1980. – 260 с.
21. Толочко, А.П. "История Российская" Василия Татищева: источники и известия / А.П. Толочко. – М.: Новое литературное обозрение; Киев: Критика, 2005. – 544 с.
22. Алексеев, Л.В. Западные земли домонгольской Руси: очерки истории, археологии, культуры: в 2 кн. / Л.В. Алексеев: Ин-т археологии РАН. – М.: Наука, 2006. Кн. 1. – 2006. – 289 с.
23. Алексеев, Л.В. Западные земли домонгольской Руси: очерки истории, археологии, культуры: в 2 кн. / Л.В. Алексеев; Ин-т археологии РАН. – М.: Наука, 2006. Кн. 1. – 2006. – 167 с.
24. Штыхов, Г.В. Древний Полоцк (IX – XIII вв). / Г.В. Штыхов. – Минск: Наука и техника, 1975. – 136 с.
25. Штыхов, Г.В. Города Полоцкой земли (IX – XIII вв.) / Г.В. Штыхов. – Минск: Наука и техника, 1978. – 160 с.
26. Лысенко, П.Ф. Туровская земля IX – XIII вв. / П.Ф. Лысенко. – Мінск: Беларус. навука, 1999. – 268 с.

27. Лысенко, П.Ф. Дреговичи / П.Ф. Лысенко. – Мінск: Наука и техника, 1991. – 215 с.
28. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2000. – Т. 1: Старажытная Беларусь: Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. – 351 с.
29. Фроянов, И.Я. Начало русской истории / И.Я. Фроянов. – М.: Издат. дом. "Парад", 2001. – 975 с.
30. Фроянов, И.Я. Города – государства Древней Руси / И.Я. Фроянов, А.Ю. Дворниченко. – Л.: Изд-во Ленингр. унт-та, 1988. – 269 с.
31. Толочко, А.П. Князь в Древней Руси: власть, собственность, идеология / А.П. Толочко. – Киев: Наук. думка, 1992. – 224 с.
32. Назаренко, А.В. К проблеме княжеской власти и политического строя Древней Руси. Замечания и размышления по поводу книги: Толочко А.П. Князь в Древней Руси: власть, собственность, идеология. – Киев, 1992 / А.В. Назаренко // Средневековая Русь. Ч. 2. – М.: Эдиториал УРСС, 1999. – 208 с.
33. Мельникова, Е.А. К типологии предгосударственных и раннегосударственных образований в Северной и Северо-Восточной Европе (Постановка проблемы) [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.rusladoga.ru/bb/viewtopic.php?t=138&sid=2564553d151ee543622722d87cb727ce. – Дата доступа: 03.01.2013.
34. Свердлов, М.Б. Домонгольская Русь: Князь и княжеская власть на Руси VI – первой трети XIII в. / М.Б. Свердлов. – СПб.: Академ. проект, 2003. – 736 с.
35. Марзалюк, І.А. Гістарычная самаідэнтычнасць насельніцтва Беларусі ў XI – XVII стст. / І.А. Марзалюк [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.lingvo.minsk.by/mab/Glook/BVOKS/Albaruthenica.htm. – Дата доступу: 09.01.2013.
36. Данилевский, И.Н. Загадки "Русьской земли" / И.Н. Данилевский [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www. krotov.info/history/10/2/1997dani.html/. – Дата доступа: 09.01.2013.
37. Данилевский, И.Н. Повесть времянных лет: герменевтические основы источниковедения летописных текстов / И.Н. Данилевский. – М.: Аспект-Пресс, 2004. – 370 с.
38. Пузанов, В.В. Древнерусская государственность: генезис, этнокультурная среда, идеологические конструкты / В.В. Пузанов. – Ижевск: Издат. Дом "Удмуртский университет", 2007. – 624 с.
39. Данилевский, И.Н. Древняя Русь глазами современников и потомков (IX – XII вв.) / И.Н. Данилевский. – М.: Аспект-Пресс, 1998. – 205 с.
40. Данилевский, И.Н. Русские земли глазами современников и потомков (XII – XIV вв.) / И.Н. Данилевский. – М.: Аспект-Пресс, 2001. – 389 с.
41. Темушев, С.Н. Начало Руси: генезис государственности в источниках и исторической традиции / С.Н. Темушев. – Минск: БГУ, 2008. – 159 с.
42. Темушев, С.Н. Легенды о происхождении власти в западно- и восточнославянских источниках / С.Н. Темушев // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны. Вып. 1 / рэдкал.: С.М. Ходзін [і інш.]. – Мінск: БДУ, 2002. – С. 160 – 171.
43. Плотникова, О.А. Генезис и легитимизация института княжеской власти в древнерусском обществе VI – XII вв. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://dibase.ru/article/23032009_plotnikovaoa/5. – Дата доступа: 16.01.2013
44. Плотникова, О.А. Кристаллизация института княжеской власти как социально-политического компонента древнерусской цивилизации / О.А. Плотникова [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://zpu – jornal.ru/e zpu/2008/6/Plotnikova_crystallization. – Дата доступа: 16.01.2013.

*Паступіў 05.03.2013*

**PRINCELY POWER ON BELARUSIAN LANDS OF THE IX$^{TH}$ – FIRST HALF OF THE XIII$^{TH}$ CENTURY IN BELARUSIAN AND RUSSIAN HISTORIOGRAPHY**

***JU. KEZHA***

*The main works of Belarusian and Russian historians of the XVIII$^{th}$ – the early XXI$^{th}$ centuries are considered, which are devoted to researches of the process of establishing and developing of the statehood and princely power in the context of political history and political system of Ancient Russia of the IX$^{th}$ – the first half of the XIII$^{th}$ century. In different periods of Russian and Belarusian historical science the institute of princely power was considered from different points of view according to civic priorities of the period of work of a researcher and his social, political and economical components.*